

# Галіна АНТОНАВА

Антонава Галіна Францішкаўна нарадзілася 29 сакавіка 1977 года на Смаргоншчыне, у вёсцы Сасноўка. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Журналіст. У прафесіі – з 2000 года. На працягу апошніх 16 гадоў працуе карэспандэнтам раённай газеты “Светлы шлях”. У 2021 годзе стала лаўрэатам прэміі А. І. Дубко “За творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва” (намінацыя “Журналіст”), у 2019 годзе – атрымала дыплом “За лепшае асвятленне тэматыкі Дня беларускага пісьменства ў рэгіянальных СМІ”.

Пісаць і выдаваць кнігі пісьменніца пачала нечакана для сябе. Штуршком да гэтага стаў аўтарскі газетны праект “Памяці маэстра”, прысвечаны музыку, настаўніку, фатографу Аляксандру Дзяругу. Гэта 21 нарыс пра культуру Смаргоншчыны і апантаных людзей, якіх аб’яднаў Аляксандр Анісімавіч. Калі праект блізіўся да завяршэння, узнікла пытанне: “Як матэрыялы захаваць?”. Адказ знайшоўся – трэба выдаць кнігу. Цяпер можна з упэўненасцю сцвярджаць, што кніга “Дзяруга” – гэта летапіс Смаргоншчыны, гісторыі края і памяць пра выдатных людзей. Неўзабаве пабачыла свет яшчэ адна кніга Галіны Антонавай – “Самародкі”, у якую ўвайшлі газетныя матэрыялы, што друкаваліся пад рубрыкай “З крыніц народных, жыватворных”. Героі кнігі – людзі, якія не мелі прафесійных педагогаў, сваё майстэрства пераймалі ад таленавітых, больш сталых людзей, якія жылі побач. Раскрыццё асобы самадзейнай мастачкі Ніны Бохан (без перабольшання, новага імя ў народным мастацтве) – гэта вялікае журналісцкае даследаванне, самая грунтоўная работа праекта, якая прадаўжаецца. Потым з’явілася кніга “Веліч малой радзімы”. Пад адной вокладкай былі змешчаны нарыс пра жыццёвы і творчы шлях смаргонскай мастачкі Ліліі Трохалевай, 150 твораў алейнага жывапісу і малюнкаў (рэпрадукцый).

Інфармацыю для кнігі-альбома пісьменніца збірала не адна. Ёй дапамагалі мастак Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея Дзмітрый Ярмак і заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Церабун. Кніга-альбом “Космас Анатоля Антонава” – пра жыццёвы і творчы лёс самадзейнага мастака з горада Петрыкава Гомельскай вобласці, свёкра Галіны Францішкаўны, які пайшоў у іншы свет у 2007 годзе. А пасля пісьменніцы пастуліла прапанова падрыхтаваць да друку рукапісы смаргонскага доктара Юрыя Чапёлкіна “Нататкі правінцыйнага хірурга”. На працягу дзевяці месяцаў жанчына-літаратар выконвала гэтую работу. Выступіла ў ролі рэдактара, стыль-рэдактара, складальніка і суаўтара аднаго з раздзелаў выдання. У наступнай кнізе “Месца пад сонцам” былі змешчаны 12 нарысаў пра таленавітых людзей Смаргоншчыны, большасць з іх – нашы сучаснікі. І вось – чарговая кніга “Знайсці сябе”. Лагічны працяг “Месца пад сонцам”, выданне якое пабачыла свет напрыканцы 2024 года. 25 нарысаў – 25 цікавых сустрэч з людзьмі, якія знайшлі сябе ў гэтым складаным і мітуслівым жыцці, якія ўпэўнена гадамі ішлі да сваёй мэты. Большасць нарысаў, якія змешчаны ў кнізе, – вынік аўтарскага газетнага праекта “Сіла стварэння”.

Аўтарскія публікацыі Галіны Антонавай пра таленавітых смаргонцаў друкаваліся ў газетах: “Культура”, “Літаратура і мастацтва”, “Настаўніцкая газета”, “Аргументы и факты”, “Сельская газета”, “На страже”, “Краязнаўчая газета”, “Гродзенская праўда”, “Мінская праўда”, “Астравецкая праўда”, “Маладзечанская газета”, “Родны край”, часопісах “Аве Марыя”, “Алеся” і іншых выданнях. Г. Ф. Антонава прымала ўдзел у стварэнні тэлепраграм тэлеканала “Беларусь 3” “Маляваныя дываны” і “Камертон” (пра заслужанага дзеяча мастацтваў РБ Уладзіміра Церабуна). Была госцем аўтарскай праграмы Навума Гальпяровіча “Суразмоўцы”.

“…Кожны раз, калі знаёмлюся з новым героем нарыса, па-сапраўднаму пачынаю яго любіць, – прызнаецца пісьменніца. – А пра любімага чалавека хочацца расказаць цікава, шчыра, душэўна, глыбока. Тое, што пачынаю пісаць на рабоце, звычайна завяршаю дома. На пліце варыцца суп – а я шліфую тэксты. Мае дамашнія (я жонка і маці траіх дзяцей) прывыклі мяне бачыць за ноўтбукам. На жаль, не так шмат знаходжу часу для яшчэ адной любімай справы – чытання. Апошнім часам, у асноўным, чытаю творы беларускіх публіцыстаў: Зіновія Прыгодзіча, Алеся Карлюкевіча, Уладзіміра Ліпскага… Прадаўжаю даследаваць творчасць самадзейнай мастачкі Ніны Бохан, якая стварала маляваныя дываны, карціны, абразы. Час ад часу арганізоўваю выязныя выставы работ мастачкі. Гэтым летам такія выставы прайшлі ў музеі-сядзібе Міхала Клеафаса Агінскага падчас “Вяргіневага балю” і ў Крэве – для тых, хто шчыраваў на раскопках Крэўскага замка. “У здаровым целе – здаровы дух” – гэта перакананне вядзе мяне ў трэнажорную залу, на заняткі па фітнесе. Тут я атрымліваю выдатную перазагрузку, пасля чаго мая “палітра” ачышчаецца, і ў мяне з’яўляецца магчымасць ствараць на ёй нешта новае”.

Краязнаўца, публіцыст Галіна Антонава ў шэрагах Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2024 года. Жыве ў Смаргоні. Піша на беларускай і рускай мовах.

# ЯГО ПТУШКА ВЕЧНАСЦІ

**Неяк ноччу мне прысніўся паэт Мар’ян Дукса. Мар’ян Мікалаевіч у бялюткай майцы і спартыўных штанах ішоў па рамонкавым полі. У такой вопратцы я яго бачыла толькі аднойчы, калі мы з сяброўкай наведвалі яго ў бальніцы.**

**У сне паэт выглядаў свежа, бадзёра. Быццам, самая вялікая рамонка ажыла, пачала рухацца і ўсміхацца. Мар’ян Мікалаевіч нічога не гаварыў, толькі ішоў і ўсміхаўся. Як звычайна ўсміхаўся пры сустрэчы…**

– Хто ў Сашы Дуксы бацька? Паэт?!

– Паэт… – адказала мне аднакласніца і паказала мужчыну, які ішоў насустрач.

У 1988 годзе наша сям’я пераехала ў Солы, і я пайшла ў мясцовую школу ў пяты клас. На той час я зусім не ўяўляла, дзе жывуць паэты. Думала, можа, дзе ў кніжках ці недзе ў вялікім горадзе, у Мінску хаця б.

Я ўбачыла мужчыну з вельмі шырока распраўленымі плячыма і высока паднятай галавой. Мне нават падалося, што ў яго за плячыма крылы, таксама шырока распраўленыя, і ён вось-вось узмахне імі і запарыць высока ў небе, як прыгожы лебедзь ці бусел. Ці Пегас.

На працягу вучобы ў школе мы, дзеці, ніколі не гутарылі з Мар’янам Мікалаевічам. Ён не прыходзіў да нас выступаць, ніяк не піярыў сябе. Я была ўпэўнена, што сапраўдныя паэты так сябе і паводзяць: пішуць і друкуюцца, жывуць у сваім свеце, паўсядзённыя клопаты іх не тычацца.

А на выпускным вечары ў чэрвені 1994 года мае бацькі сядзелі за сталом насупраць Мар’яна Мікалаевіча і пра нешта ажыўлена гаварылі. Я так здзівілася, бо ведала, што ні тата, ні мама асабліва не цікавіліся паэзіяй. “Тады пра што можна гаварыць з паэтам?” – думала тая, якая збіралася паступаць на філалагічны факультэт. Я не вытрымала і падышла да бацькоў.

– Якая ў цябе, Галя, арыгінальная сукенка, – першае, што пачула ад Мар’яна Мікалаевіча.

Вось чаго не спадзявалася, дык таго, што паэт пахваліць маю сукенку. Мне хацелася прызнацца, што яе пашыла мама па маім эскізе, але не хапіла смеласці.

У той год і Саша Дукса, і я паступілі ў БДУ. Я – на філфак, Саша – на мехмат. Жылі мы ў адным студэнцкім інтэрнаце. З Мар’янам Мікалаевічам даволі часта бачыліся на чыгуначным вакзале – бацькі заўсёды праважалі нас у Мінск. Мар’ян Мікалевіч цікавіўся маёй вучобай, расказваў пра сябе.

Яшчэ больш нас зблізіла мая работа ў смаргонскай раённай газеце “Светлы шлях”. Неяк Мар’ян Дукса прапанаваў мне пісаць у рэлігійны каталіцкі часопіс “Авэ Марыя”, дзе ён нярэдка друкаваў свае вершы. Я пачала пісаць на тэмы, на якія раней ніколі не пісала, з дзясятак матэрыялаў былі надрукаваны ў часопісе.

У “Светлы шлях” Мар’ян Мікалаевіч часта прыносіў свае новыя творы. Ён дружыў з Іванам Іванавічам Лазутам, намеснікам радактара. Яны былі на адной хвалі. Блізкія па ўзросце. Абодва інтэлігентныя, эрудыраваныя, разважлівыя, глыбокія, культурныя, высокадухоўныя. З нашай журналісткай і паэткай Алай Клемянок таксама меў шмат агульнага. У акружэнні такіх творчых людзей я адчувала сябе вельмі камфортна.

Мар’ян Мікалаевіч часам спагадаў нам, рэгіянальным журналістам: “Як няпроста працаваць у “раёнцы”. Гэта з рэспубліканскага СМІ прыехаў журналіст, паехаў – і з ім усё паехала. А з “раёнкі” – журналіст застаецца і прадаўжае жыць між людзей. Вельмі адказная праца”.

Мар’ян Дукса быў глыбока веруючым чалавекам. Каталіком. Спяваў у касцельным хоры. Яго паэзія, асабліва апошняга часу, была прасякнута рэлігійнай тэматыкай. “Я настойліва сцвярджаю, што паэзія – гэта своеасаблівая пропаведзь – палітычная, сацыяльная, рэлігійная, маральная, эстэтычная, пропаведзь заўсёды гуманістычная па сваёй сутнасці. Пропаведзь, дадзеная Богам”, – пісаў Мар’ян Мікалаевіч.

У 2015 годзе ў паэта выйшаў чарговы (апошні пры жыцці) зборнік вершаў “Птушка вечнасці – душа”. Вобраз Птушкі-душы, якая крыліцца, сцішвае лёт, прабывае ў самоце і рыхтуецца вярнуцца дадому – у неба, можна прасачыць ва ўсёй творчасці Мар’яна Дуксы. Незвычайны вобраз, які ён пакінуў у літаратуры і ў памяці чытачоў.

Мар’ян Мікалаевіч адышоў у Вечнасць у Вялікую пятніцу. Яго птушка-душа накіравалася ў свой Вечны дом.

…Летам 2018 года, калі мы з сяброўкай даведаліся, што Мар’ян Мікалаевіч ляжыць у кардыялагічным аддзяленні бальніцы, вырашылі яго наведаць. Мы былі рады, што ён пайшоў на папраўку, выглядаў цудоўна ў

сваёй бялюткай футболцы і спартыўных штанах. Наша сустрэча была надзвычай эмацыянальнай і пазітыўнай. На жаль, гэта была апошняя сустрэча, калі мы маглі добра нагаварыцца.

…Ёсць людзі, якіх ты асабліва цэніш. І нават калі ты бачышся з імі рэдка, але нешта пра іх чуеш, чытаеш, ведаеш, што яны жывыя – гэта думка цябе грэе. Калі такія неверагодныя людзі адыходзяць, здаецца, частка ад цябе адрываецца.

У лепшы свет паэт пайшоў 19 красавіка 2019 года. А ў пачатку 2023-2024 навучальнага года Сольскай сярэдняй школе, дзе Мар'ян Мікалаевіч пачынаў свой педагагічны шлях, было прысвоена імя Мар'яна Дуксы. Кранальна. Нават не ведаю, як бы адрэагаваў сам Мар'ян Мікалаевіч, калі б пра гэта даведаўся. Ён быў не з тых, каго цешыла слава. Вылучаўся надзвычайнай сціпласцю. А я зарадавалася: памяць пра добрага чалавека і выдатнага паэта трапятліва захоўваецца.

Дарэчы, з гэтай нагоды ў школе аднавілі музейную экспазіцыю. Родныя перадалі для экспанавання рэчы паэта. Сярод іх – любімая цёплая камізэлька (у кватэры, дзе жыла сям'я паэта, зімой часта было холадна), кнігі, настольная лямпа, звычайны рабочы стол (не масіўны, не дубовы, якія я бачыла ў музеях іншых паэтаў і пісьменнікаў). Бадай, самая дарагая рэч – нямецкая друкаваная машынка. Па ўспамінах жонкі паэта Леакадзіі Міхайлаўны, на машынку Мар'ян Мікалаевіч добра патраціўся – цэлую зарплату аддаў. Але гэта і не дзіўна: што можа быць для творцы важней за такую прыладу працы? І яшчэ адзін цікавы экспанат – фігура Францішка Асізскага – каталіцкага святога, якога лічаць апекуном паэтаў.

Нядаўна я даведалася і пра тое, што арганістка Марыя Трапашка з парафіі Дабравешчання Прасвятой Дзевы Марыі (касцёл знаходзіцца ў Вішневе Валожынскага раёна) напісала музыку на вершы Мар'яна Дуксы – і яны гучаць падчас набажэнстваў. Творчая спадчына паэта прадаўжае жыць.

# ПЯТУХ-АХОЎНІК

**“Напішы! А то самае цікавае з работы журналіста часта застаецца па-за кадрам”, - настойвала мая сяброўка. І я вырашыла, як на духу, расказаць, якія прыгоды давялося перажыць, калі здабывала фотаздымкі самабытных кушлянскіх музыкаў.**

Барабаншчык Генадзь Бярнат жыў праз дарогу ад музея-сядзібы Францішка Багушэвіча, на хутары. З жонкай Бярната мы пазнаёміліся на свяце, якое ладзілася ў музеі. Бабуля сказала, што ма́е здымкі музыкаў і гатова іх паказаць, але хоча крыху паглядзець канцэрт. Выседзела на свяце гадзіны дзве і прапанавала пайсці ў госці.

Ідзём…

–Канцэрт харошы, але марожанага не паела, – кажа жанчына. – Не прадавалі.

Бабуля расказвае, што амаль усё жыццё адпрацавала паляводам, пазней – тэхнічкай у школе.

–А дзе тут было болей працаваць? – задае яна амаль рытарычнае пытанне.

Даходзім да хаты.

–Дзе там той пятух? Глядзіце, асцярожна, надта б'ецца… - чую перасцярогу.

–О! А я якраз у чырвоным…

–Кідаецца ён і на чырвонае, і на цвятное…

–Дык чаму вы яму галаву не адкруціце? – кажу і сама дзіўлюся асабістай жорсткасці.

–Няма як. Адзін застаўся.

Гаспадыня адчыняе брамку – і рыжы прыгажун з вялікім бардовым грэбенем адразу рэагуе на нашы постаці. Бяжыць – зямля дрыжыць. Мая новая 76-гадовая знаёмая мужна становіцца на абарону: махае рукамі-нагамі – і пятух рэціруецца.

Перад хатай – яшчэ адна агароджа і брамка. Тут петушынае царства заканчваецца. Далей пятуху хады няма. Мы знаёмімся з Бярнатам, абмяркоўваем тэму, што бабуля не змагла паесці марожанага (адчуваецца,

што муж захваляваўся на гэты конт), спакойна гутарым, глядзім альбом з фотаздымкамі, фатаграфуемся. Успамінаем адкрыццё музея-сядзібы пасля рэканструкцыі.

Доўга сядзець няма як: свята ж у Багушэвіча! Развітваюся. Зачыняю брамку. Гаспадар абапіраецца на плот – а я бачу цікавы ракурс для фота. Пачынаю фатаграфаваць. Гляджу вынік – задавольваюся. Махаю на развітанне рукой гаспадару. Раблю некалькі крокаў – ўспамінаю пра пятуха і азіраюся…

А на арэну зноў… не, не выходзіць, выбягае агрэсіўны Цар. Рухаецца мэтанакіравана ў мой бок. А я – адна, без бабулі. І не маю вопыту кантактаваць з пятухамі.

Імгненна перад вачыма праплывае карціна, як пятух скікае мне на спіну і пачынае дзяўбці прама ў маю скураную “касуху”. Вялікая раскоша. І для мяне, і для “ваяра”. Таму я кідаюся наўцёкі куляй (усё ж недарэмна хаджу на стадыён), адначасова адным рухам закідваю фотаапарат у сумку.

Адцягваю засаўку і зачыняю брамку… якраз перад дзюбай майго апанента, а вось засаўку назад вярнуць не магу.

Нас раздзяляе невысокая агароджа – і я дапускаю думку, што пятух можа праз яе пераскочыць. Мы глядзім адно аднаму ў вочы і не рухаемся. Паціху я адпускаю брамку і пачынаю задам адыходзіць. Баюся, раптам вароты адчыняцца. Не, усё на месцы – і вароты, і пятух.

І тут ззаду для мяне – новая нечаканасць. Пяткай чапляюся за стары вялікі пень і раблю такі “піруэт” (толькі не з наска) – любая балерына пазайздросціць…

Даўно я так не прызямлялася. Хіба ў дзяцінстве.

Прызнаюся, у барацьбе з кушлянскім пятухом я пацярпела фіяска. І атрымала сіняк на правай назе. А пятух – гармоны свае толькі “пагрэў”. Малайчына. Добра дом ахоўвае.

# НІНА БОХАН – МАСТАЧКА, ЯКАЯ МАЛЯВАЛА ДЫВАНЫ І ГРОШЫ

**Ніколі б не падумала, што здымак з чужога фотаальбома стане нагодай для журналісцкага даследавання даўжынёй амаль у пяць гадоў. Асабіста для мяне самадзейная мастачка Ніна Бохан – сенсацыя.**

Практычна дэтэктыўная гісторыя, пра якую пойдзе размова ў гэтым матэрыяле, пачалася недзе напрыканцы студзеня 2019 года. Аляксей Крукоўскі з Мінска, сябра Студэнцкага этнаграфічнага таварыства, даслаў мне фота, зробленае падчас этнаграфічнай экспедыцыі па Смаргоншчыне летам 2018 года. На здымку – маляваны дыван, які ўдзельнікі экспедыцыі купілі ў Браніславы Шутовіч з Лісічына.

Маляванка з аленямі ўразіла сваім самабытным, у нейкай ступені дзіцяча-наіўным, “почыркам”, незвычайным сюжэтам і яркасцю фарбаў. Прызнацца, нічога падобнага я не бачыла, хоць часта бываю ў вёсках і даволі шмат пішу пра сталых людзей.

Яшчэ адну маляванку этнографам перадала журналістка Святлана Станкевіч, шукальніца “скарбаў” даўніны, якая літаральна выцягнула яшчэ адных “аленяў” з-пад завалаў старой хаты ў Клочках. Знойдзены дыван аказаўся вельмі падобным да лісічынскага.

### Боханіхін акоп

“Народныя маляванкі – жанр народнага мастацтва, які доўгі час быў недаацэнены прафесіяналамі і адпаведна публікай, – кажа Аляксей Крукоўскі. – Да канца 70-х гадоў мінулага стагоддзя ў Беларусі амаль ніхто сур’ёзна не займаўся вывучэннем маляванак. Гэты жанр не чыстае народнае мастацтва. Ён прыйшоў з горада ў вёску, лічыўся другасным, таму доўгія гады памылкова думалі, што займацца даследаваннем маляванак

няварта. Пры тым, што ва ўсім свеце ў другой палове XX стагоддзя адбыўся бум цікаўнасці да наіўнага мастацтва. І не вельмі істотна, адкуль бралі мастакі свае сюжэты. Гэта адмысловы спецыфічны жанр, у якім праяўляецца народны талент".

Пасля майго знаёмства з першай маляванкай прайшло месяцы чатыры. Аднойчы ў знаёмай швачкі Наталлі Трацяк я разглядала старыя фотаздымкі. Мяне зацікавіла фота, зробленае ў Ленінградзе каля паўсотні гадоў таму. Сваякі Наталлі сфатаграфаваліся на фоне маляванага дывана. Гаспадыня ўзгадала, што на Смаргоншчыне таксама была самадзейная мастачка. Тады ўпершыню я пачула пра Боханіху – менавіта так называлі па-мясцоваму Ніну Бохан. У цяжкі пасляваенны час, здавалася б, усім было не да карцін. А жанчына хадзіла па вёсках і зарабляла на хлеб маляваннем. Людзі, хоць і жылі бедна, але шукалі спосабы ўпрыгожыць сваё жыллё.

Калі я расказала Аляксею Крукоўскаму пра свае здагадкі наконт аўтарства "аленяў", ён зацікавіўся асобай Ніны Бохан і актыўна далучыўся да пошуку інфармацыі па-за межамі Смаргоншчыны.

"Я была даволі малая, але помню Нініны работы, у суседзяў мастачка размалявала дзверы і сцяну, а яе дываны былі практычна ў кожнай укропенскай хаце. Гэта маляванка з Лісічына падобная да тых, – удакладняе Наталля Трацяк. – Я помню, што на адной карціне маглі быць і возера з лебедзямі, і алені, і бярозы, і кветкі буйныя – ружы і лілеі. Маляванкі нагадвалі дзіцячы малюнак. Толькі вялікага памеру. Не пейзажы Шышкіна ці Левітана. Але ў сціплы хатні інтэр'ер яны цудоўна ўпісваліся".

91-гадовая Вера Кабак, маці Наталлі Трацяк, расказвала, што Ніна з'явілася ва Укропенцы пасля вайны не адна – з братам і сёстрамі. Яны былі, як казалі, "бежанцамі". Бацькоў не мелі. Жылля таксама. Хадзілі па людзях. Ніна малявала, старэйшая сястра і брат дапамагалі ёй. Дзе працавалі, там і жылі. У астатні час спыняліся ў лесе, паміж Чарнятамі і Укропенкай, у адной з зямлянак, дзе вайной хаваліся мясцовыя жыхары. Той акоп у народзе празвалі Боханіхін.

Пра родных мастачкі вядома няшмат. Яе старэйшая сястра Вольга пачала сустракацца з мясцовым хлопцам Ёзафам і зацяжарыла, нарадзіла дзяўчынку, але сям'і ў іх не атрымалася. Вольга з дзіцём некуды з'ехала.

Толькі ў 80-х гадах XX стагоддзя малодшая сястра Вера знайшла Вольгу, якая жыла пад Ленінградам. Сёстры збіраліся пабачыцца, але, на жаль, Вольга раптоўна памерла.

Пётр, брат Ніны, узгадваецца ва ўспамінах толькі раз. Пляменніца паказала фотакартку, якую ў 1953 годзе Пётр падарыў Ніне, калі яны сустрэліся ў Іжы Вілейскага раёна.

**Народны жарт**

Смаргонец Міхаіл Бохан, 76-гадовы стрыечны пляменнік мастачкі, удакладняе: "Пасля вайны ў нас сапраўды было шмат бежанцаў. Неўраджай 1946 года прынёс страшэнны голад. Людзі хадзілі па хатах, прасілі есці.

Боханы на Смаргоншчыну прыйшлі з Вілейскага раёна. Жылі ў вёсцы Пукелы (цяпер Засценкі). Бацька Ніны таксама быў мастаком. Ён вёў вандроўны лад жыцця. Я быў падлеткам, калі з мамай трапіў у царкву ў вёсцы Ручыца. Мама мне ўзгадала, што напачатку 40-х гадоў мінулага стагоддзя родны брат майго дзеда Сцяпан Бохан распісваў царкву. Мне казалі, што фрэскі і дагэтуль захаваліся".

У сеціве фотаздымкаў з роспісамі Ручыцкай царквы я не знайшла. Паехала на Вілейшчыну, каб на свае вочы пабачыць, што захавалася. Фрэскі сапраўды ёсць. Высока пад столлю. Сцены святыні шмат разоў перабельвалі, але ні ў каго не паднялася рука поўнасцю знішчыць старыя роспісы. Вобразы святых выглядаюць, як аплікацыі на выбеленым фоне. На жаль, ні мясцовыя жыхары, ні святар, які служыць у Гануце працяглы час, нічога не ведаюць пра аўтарства гэтых роспісаў.

Міхаіл Бохан з усіх дзяцей дзядзькі найбольш помніць Ніну. Яна нарадзілася ў 1917 годзе. Пасля вайны, зусім нядоўга, жыла ў смаргонскім Доме культуры, дзе ёй адвялі невялікі пакойчык. Афармляла наглядную агітацыю, афішы для кіно. Ездзіла да сваякоў у Чарняты і Укропенку, там малявала для мясцовых жыхароў.

1947 год стаў трагічным у лёсе мастачкі. У Вільнюсе яе злавілі з падробнымі грашыма: сама намалявала. У міліцыю пра яе, быццам, данёс кавалер, калі ўбачыў, як Ніна капіруе асігнацыі. Свой тэрмін – сем гадоў – адбывала на Калыме.

Гісторыя з Нінай і падробнымі грашыма ператварылася ў народны жарт. Працяглы час людзі яе ўспаміналі прымоўем: не маеш грошай – ідзі да Боханіхі, хай намалюе.

Ніна вярнулася з Калымы на Смаргоншчыну ў 1954 годзе. Пасялілася на хутары Кулі паблізу вёскі Чарняты – прытуліла жанчыну цётка Броня, удава па Нініным стрыечным браце.

«Мы жылі тады ў старой лазні "па-чорнаму", прыстасаванай пад жыллё, з земляной падлогай і акенцам у адно шкло. Мама, два браты, сястра і я. Бацька з вайны не вярнуўся, прапаў без вестак, – напісала ў сваім пісьме з Анапы 76-гадовая Ганна Бохан, адна з дачок Браніславы, якую удалося знайсці з дапамогай сацыяльных сетак. – У гэту хатку прыйшла пажыць да нас Ніна Сцяпанаўна пасля адбывання тэрміну. Была моцна змардаваная, без зубоў, бо перахварэла на цынгу. На зоне яна таксама займалася маляваннем і афармленнем нагляднай агітацыі. Аднойчы замест слова "воздушные" напісала "воздэху", за гэта яе пакаралі карцарам і забаронай на "художества".

У нашай хаціне Ніна намалявала на печцы розныя кветкі, а на палатне – лебедзяў і аленяў. У мяне застаўся партрэт бацькі, які мастачка перамалявала з маленькага фотаздымка".

**Маляванкі – за прадукты**

"Малявала Ніна вельмі шмат. У хляве ці пад паветкай. Розныя дываны з лебедзямі, аленямі, прыродай, кветкамі. Мяняла ў людзей іх на яйкі, бульбу, муку ці прадавала па вёсках і ў Смаргоні на кірмашы, – удакладняе Міхаіл Бохан. – Афармляла насценную агітацыю, плакаты з надпісамі тыпу "Дагонім, перагонім, пераможам". Пісала па клетачках партрэты правадыроў – Леніна і Сталіна.

Каб "карціна" была больш трывалай, аснову грунтавала растворам крухмалу ці зубнога парашку (тады фарбы прыемна пахлі), а калі наносіла грунтоўку з варанага сталярнага клею жывёльнага паходжання, то пах быў невыносна гідкі, затое малюнак атрымліваўся бліскучы. Фарбы купляла ў Смаргоні. На вуліцы Кірава жыла Зязюля. Яна вазіла іх з Вільнюса – вельмі яркія, з гадамі зусім не бляклі".

У Чарнятах Ніна пражыла да канца 50-х гадоў, пакуль сын гаспадыні не ажаніўся. Адтуль яна накіравалася да малодшай сястры Веры ў Ленкаўшчыну Маладзечанскага раёна. Пасля гэтага Міхаіл бачыў цётку толькі аднойчы. Недзе напачатку 70-х гадоў XX стагоддзя яна заязджала ў госці. "Вельмі жвавая, стройная, голас нізкаваты, пастаўлены", – такой запомніла мастачку жонка Міхаіла Аляксеевіча, якую, дарэчы, таксама завуць Ніна Бохан.

**Абрас, абрус і "тры волаты"**

Недзе ў 1963-1964 гадах Ніну бачылі на Астравеччыне. Сын Броні, Аляксандр Бохан, з жонкай Фаінай перабраўся ў вёску Віктасіна. Пачаў там будаваць дом. "Мне было гадоў шэсць, калі ў нас з'явілася сваячка-мастачка, – расказвае іх дачка Людміла Гродзь з вёскі Варона. – Ніна жыла ў нас, харчавалася і малявала. Рабочым кабінетам ёй служыў вялікі пакой у хаце, у ім тата яшчэ нават падлогу не паслаў. Яна малявала дываны з вялікімі і малымі вянкамі з кветак, а таксама з казачнымі сюжэтамі, жывёл (звычайна аленяў ці ласёў), лебедзяў. Хадзіла, каб прадаць свае маляванкі, у Валэйкавічы, Старую Рудню, іншыя вёскі (да Клочак, дзе была знойдзена другая маляванка, – рукой падаць – аўт.). Там таксама спынялася ў мясцовых людзей і малявала, а пасля вярталася ў Віктасіна".

У хаце Боханаў у Віктасіна доўга вісеў на сцяне дыван з выявамі жанчын у хітонах. На жаль, да гэтага часу ён не захаваўся. А вось другі, ідэнтычны, знайшоўся ў Ніны Колтан, роднай сястры Фаіны Бохан. Гэта была наша першая знаходка, якую дакладна стварыла Ніна. Але па сюжэце і тэхніцы выканання вельмі моцна адрознівалася ад тых маляванак, якія належаць СЭТаўцам.

Яшчэ адзін прыгожы дыван – з выявамі трох волатаў – знайшоўся ў Варнянах. Бацькі Людмілы Кухарэвіч купілі яго на кірмашы ў Міхалішках бліжэй да сярэдзіны 60-х гадоў.

Пошукі прадаўжаліся.

У Маладзечанскім раёне знайшліся раннія работы Ніны Бохан – "кветкавы" абрус і вельмі цікавы абраз Святой Кацярыны і адзін дыванок – "Алені і лебедзі", намаляваны на дзіцячай коўдры. Многае распавяла пра сваячку пляменніца Галіна з Радашковічаў.

**"Козыры" самадзейнай мастачкі**

Напрыканцы жніўня 2019 года ў смаргонскай газеце "Светлы шлях" быў змешчаны фрагмент маляванкі з Лісічына і зварот да чытачоў, каб дапамаглі ўстанавіць аўтара работы і расказалі штосьці пра Ніну Бохан. Адзін тэлефонны званок раскрыў нам "козыры" самадзейнай мастачкі. Аказалася, працяглы час яна жыла ў вёсках Сінькоўскага сельсавета. У сярэдзіне 70-х гадоў мінулага стагоддзя за ежу і начлег стварала прыгажосць у хатах мясцовых жыхароў. Усе насілі ёй свае старыя капы, а мастачка ператварала іх у квяцістыя дываны – адзін такі

знайшлі ў Сяльцы. Вялікая маляванка, на ўсю шафу, з вельмі цікавым сюжэтам, захавалася ў вёсцы Наваспаск, у сям'і Ульяш.

У Сяльцы, у хаце 85-гадовай Галіны Вяршковіч, чакаў сапраўдны скарб: карціны, якія малявала Ніна Бохан на сценах.

Выява трох волатаў, памерам 135х115 см, паверх якой павесілі сучасны дыван. Дзве іншыя – заклеілі шпалерамі. Тым не менш гаспадыня, убачыўшы зацікаўленасць да насценных малюнкаў, дазволіла нам іх "адкрыць" – зняць шпалеры. А пад імі… на адной сцяне – казачныя павы (паўліны) на ярка-блакітным фоне. На другой – плывуць лебедзі.

Ларыса, дачка Галіны Вяршковіч, успамінае пра нязвыклую тэхніку стварэння гэтых карцін: "Ніна малявала знізу ўверх. Напрыклад, пачынала з хваста паўліна і пайшла-пайшла ўверх. Мяне гэта здзіўляла, бо звычайна чалавека ці жывёлу пачынаюць маляваць з галавы".

**Штрыхі да партрэта**

"Ніна казала, што прыйшла ў Сялец з Ленкаўшчыны. Там жыла яе малодшая сястра, – удакладняе Галіна Вяршковіч. – Яна была вельмі простая ў зносінах, неперабарлівая ў ежы, худзенькая. Па ўсім было відаць, што многа гаравала. Вялікіх грошай за работу ў людзей не прасіла. З мужчынамі не зналася. Пастаянна была адна".

Сярод сясцёр і брата (якія былі шатэнамі з прамымі валасамі) яна найперш выдзялялася цёмненькай шавялюрай. Фарбавала вусны і вочы (што на той час было рэдкасцю), сачыла за модай. Галоўны аксесуар, па якім здалёку пазнавалі мастачку, – вялікі драўляны чамадан, дзе знаходзіліся пэндзлікі і фарбы.

**Сінькоўскія знаходкі**

Наша "паляванне" на работы мастачкі было няпростым. Кожную знаходку мы ўспрымалі, як нешта надзвычай каштоўнае. Нават не ў матэрыяльным плане. Хаця ў нейкай ступені работы маюць матэрыяльную каштоўнасць. Але яшчэ больш – гістарычную. Не так шмат вядома ў Беларусі прадстаўнікоў інсітнага (наіўнага) мастацтва.

Пакуль вялося "следства", мы знайшлі каля дваццаці работ мастачкі. І працягвалі знаходзіць… Пасля таго, як выйшла газета з другім матэрыялам, жыхарка з Сінькоў Алена Танковіч паведаміла, што напачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя мастачка малявала ў іх доме. Дагэтуль захаваліся тры маляванкі: дзве з квяцістымі вянкамі і адзін – з аленямі.

**Дыванок за халадзільнікам**

Ганна Мядзелец, якая жыве ў Смаргоні, а родам з Астравеччыны, расказала, што Ніна Бохан шмат малявала на яе малой радзіме. Гэта інфармацыя не аказалася нечаканай. Сляды мастачкі мы і дагэтуль "бачылі" на астравецкай зямлі. На жаль, не вельмі выразныя.

Ганна Антонаўна нам паведаміла, што ў яе маці ў Вашкунах захоўваліся два дываны ад Ніны Бохан. Але цяпер іх няма: мама прадала ў Ашмянах на базары. Ганна падказала канкрэтныя вёскі, дзе жыла і малявала мастачка. Усе яны – паблізу атамнай станцыі.

Мы выправіліся на Астравеччыну, спадзеючыся знайсці работы самабытнай мастачкі. Пабывалі ў Вашкунах, Чэхах, Гайголях, Бабраўніках. Гэта быў вельмі насычаны на знаёмствы дзень. Адзінаццаць чалавек нам прыпомнілі імя мастачкі. У кожнай з названых вёсак мы чулі ад людзей, што Ніна Бохан там жыла і малявала. Было гэта і на пачатку, і ў сярэдзіне 70-х гадоў мінулага стагоддзя. На пытанне: "Можа, што засталося з работ мастачкі?" – людзі адказвалі: "Былі і ў нас капы. З аленямі, коцікамі, кветкавымі вянкамі. Ой, даўно няма, павыкідалі, папалілі".

"Сляды" Ніны Бохан мы знайшліся і ў Бабраўніках. У адной – сцены, размаляваныя кветкамі. У другой хаце мы ўбачылі дыванок: на мешкавіне – прыгожая жанчына з кацянём і любімыя ружы мастачкі. На жаль, гаспадыня, якой ужо за 90 гадоў, не зразумела нашай зацікаўленасці і нават не дазволіла адцягнуць халадзільнік, каб сфатаграфаваць дыванок поўнасцю.

Тым не менш людзі падказалі, што ў аднаго мужчыны ў Вашкунах бачылі работу Ніны Бохан – карціну, прыбітую да печы. Гаспадар не адразу ўцяміў, што мы ад яго хочам. Потым доўга ўпіраўся паказваць: "У мяне там брудна, печ чорная". Але, нарэшце здаўся... І нечакана для нас выцягнуў з печы скарб – дзве карціны мастачкі, якія былі прымацаваны да сцен тоўстымі цвікамі.

Тое, што гэта работы "кісцей" Ніны Бохан, можна было разглядзець скрозь пыл і сажу. Тэма – паляванне.

Праўда, адна з карцін – "Паляўнічыя на прывале" – была моцна пашкоджана: разламана на дзве часткі, прычым ніжняя частка не захавалася поўнасцю. Тым не менш сюжэт аказаўся для нас зразумелым.

Другая работа – назавем яе "Коннік (ці паляўнічы) з "віламі" – аказалася ў даволі добрым стане. Мужчына прыпомніў мастачку Ніну, якая малявала ў Вашкунах у пачатку 1970-х гадоў. А пасля правёў нас у суседні дом. Там таксама захавалася гісторыя. Мастачка па перыметры хаты намалявала ружовыя кветкі. Нініны кветкі, адназначна.

**Разгадка знайшлася праз восем гадоў**

73-гадовая жанчына ў Чэхах, якую завуць Ліля Вайнілка (сваячка Ганны Мядзелец), цудоўна помніць мастачку. Яна пэўны час жыла і ў яе доме, малявала. "Такія прыгожыя дываны былі. Кветкі, вялікі вянок, а ў цэнтры – яшчэ адзін. А зверху па кветках – пасыпала бітымі ёлачнымі цацкамі. Прыгожа глядзеліся. Такія дываны на падлогу не пасцелеш, бо нагой не станеш. Дый і шкода: кветкі, як жывыя, – кажа Ліля Уладзіславаўна. – Але сапраўдная прыгажосць была ў доме Бразевічаў. Яны жылі ў Рудзішках. Ніна там сцены размалявала. І людзі, і кветкі, і тры волаты. Я спецыяльна туды хадзіла паглядзець. А як убачыла, прывяла яе ў Чэхі. У мяне жыла тыдні з два і малявала".

Тое, што я пачула ад Лілі Вайнілка, расказала Аляксею Крукоўскаму. Нечакана для мяне ён прыпомніў інфармацыю васьмігадовай даўніны. Фатограф Сяргей Лескець рабіў у Рудзішках здымкі апусцелай хаты, якую павінны былі знесці (што неўзабаве і было зроблена). Дык вось гэта хата і аказалася той, у якой пакінула выразны след мастачка Ніна Бохан – вялікія насценныя малюнкі. Фатограф тады не ведаў, "чыіх кісцей" работы.

"Аўтарам гэтых работ, калі меркаваць па тэматыцы і стылістыцы, хутчэй за ўсё была мясцовая жанчына. Яе працы падобныя па стылістыцы да твораў Алены Кіш – генія беларускага інсітнага мастацтва, дываны якой паспелі сабраць Міхась Раманюк і мастакі ягонага кола.

Прыкра, што няма ў каго распытаць пра яе, безыменнага народнага майстра з Астравеччыны. Да таго ж, роспіс на сценах зроблены на гіпсакардоне, што шчыльна прыбіты да брусоў. Магчымасці пераносу карцін няма. І са зносам дома сыдуць у нябыт працы яго гаспадыні", – пісаў у сваім матэрыяле Сяргей Лескець восем гадоў таму.

Безумоўна, шкада, што не ўдалося захаваць працы Ніны Бохан, якія яна стварыла на сценах дома ў Рудзішках. Але радасна ад таго, што яны засталіся на фотаздымках. Гісторыя захавалася. У адрозненні ад іншых работ мастачкі, якія людзі павыкідалі ці папалілі…

**Матацыкл у ружах**

Толькі праз два гады пошукаў удалося устанавіць, што дажывала мастачка ў Поцевічах. Ранняй вясной 1982 ці 1983 года яе прытуліла сям'я Варановічаў. "Мае бацькі былі людзьмі небагатымі, але мелі вялікае сэрца. Яны былі адкрытыя да людзей, асабліва да тых, каму патрабавалася дапамога. Яшчэ перад Нінай у іх жыў жабрак, таму нічога дзіўнага, што яны далі "вугал" для мастачкі, – кажа 76-гадовы Казімір Варановіч.

Мужчына прыпомніў, як Ніна размалявала ружаміі яго матацыкл з каляскай. Калі ехаў – усе звярталі ўвагу на прыгожы "Іж".

У жніўні ў Ніны здарылася кровазліццё ў мозг. Урачы не рашыліся везці хворую ў бальніцу.

Варановічы напісалі пісьмо Нінінай сястры Веры. Праз тыдзень сястра прыехала. Настаяла, каб Ніну забралі ў смаргонскую бальніцу. Там неўзабаве мастачка і памерла. Людзі гаварылі, што пахавала яе міліцыя на могілках непадалёку ад бальніцы.

На жаль, родныя не ведаюць пра месца пахавання. І цяпер вельмі шкадуюць, што ў апошнія гады Нінінага жыцця не зналіся з ёй.

Са сваім сынам я настойліва шукала месца пахавання мастачкі. Мы абышлі старыя смаргонскія могілкі. Дакументацыі пра пахаванні ніхто ніколі не вёў. Смаргонскія старажылы сцвярджалі, што раней тут хавалі людзей адзін на адным. Стомленыя, мы прыселі, і сын прамовіў: "Шукаць магілу – як іголку ў стозе сена".

Звестак пра Ніну няма ні ў смаргонскай бальніцы (інфармацыя пра хворых ёсць толькі за апошнія 25 гадоў), ні ў пашпартна-візавай службе, ні ў ЗАГСе. Тагачасныя міліцыянеры таксама не прыпомнілі пахаванне бяздомнай жанчыны.

Супрацоўнікі ЗАГСа вылучылі версію, што мастачка магла жыць без пашпарта. І гэту версію пацвердзілі і Ганна, і Міхаіл Боханы. Таму не захавалася і пасведчанне аб смерці.

Людзі часам называлі Ніну Бохан “жабрачкай”. А на мой погляд, яна ў прамым сэнсе была вольнай мастачкай.

**P.S.** Напрыканцы 2021 года ў “скарбонцы знаходак” налічвалася каля 30 работ самадзейнай мастачкі. Невядомае імя Ніны Бохан паціху раскрыла свае таямніцы…

У 2022 і ў 2023 гадах былі знойдзены яшчэ чатыры маляваныя дываны Ніны Бохан – у Крэве, а ў 2024 – два абразы ў Свяцілавічах. Упэўнена, што гэта не апошнія знаходкі.

# О ПТИЦЕ ВЫСОКОГО ПОЛЁТА

***сказка***

**Она родилась, чтобы стать Птицей высокого полета. А ей с детства постоянно обрезали крылья.**

Она появилась в гнезде вместе с другими птенчиками. Практически голая – с редким пушком на брюхе и спинке. Другие малыши тоже были «неодетыми». Прошло всего пару часов, все обсохли и буквально на глазах обросли красивым оперением. И уже тогда, спустя короткое время, «платье» у этой птички выделялось среди других – оно стало более густым, длинным и необычайно ярко окрашенным.

Шли дни. Птица преображалась. И всё меньше становилась похожей на своих собратьев по перу. Родители смотрели на необычное дитя и страшно переживали: «Она не такая, как все. Ей будет трудно в жизни, ведь она станет заметной для врага. И для хищника. Да и среди своих «их белая ворона» будет сильно выделяться. А зачем? Ведь проще быть, как все».

Родители долго решались на обрезание крыльев. Искали того, кто искусно сделает эту работу. Наконец, нашли. Им оказался мастер мирового класса по парикмахерскому искусству. Долго он стриг эту птицу. Его ножницы касались не только перышек, но и самого крыла: его тоже надо было обрезать. Мастер старательно ровнял «одежду». Перышко за перышком. А потом аккуратно закрашивал яркие места серым цветом. Птица мучилась, но терпела.

После обрезания её крылья стали такие же, как у собратьев. «Оздоровительная» процедура не принесла желаемого результата. Птица умирала. Ей не хотелось летать, даже ходить не было желания. И кусок в горло не лез, и мысли – в голову. А ведь до «оздоровления» она так мечтала о добре, о творчестве, о большом полете. Она грезила, что взлетит высоко-высоко, и все увидят, какие фигуры высшего пилотажа она умеет выполнять и какие необычные у нее крылья...

Прошёл месяц. Птица почувствовала себя лучше. Негаданно (в смысле, грустно) для родителей, и нежданно (в смысле, радостно) для самой Птицы, крылья снова стали расти. Еще краше, крепче, длиннее и быстрее, чем прежде. Эти крылья вселяли в неё надежду и желание творить. Она точно не знала, куда ей двигаться. Но была уверена, что крылья ей в этом точно помогут.

Правда, окружающие думали иначе. «Она не такая, как мы. Она уродлива, – твердили вокруг. – Эти крылья ее совершенно портят». Самые злые, не стесняясь, могли сильно ударить птицу. Но она старалась жить по мудрому закону: «Нас бьют – мы летаем, от боли все выше». Летать она стала реже. Обычно ночью. И очень высоко. А днём старалась поменьше показываться на глаза окружающим.

Родители, глядя на происходящее, связанное с их необычным ребёнком, сильно переживали. Снова стали искать мастера, который бы сделал крылья Птицы не такими заметными. Нашли мастера-кузнеца, который подрубил крылышки, полил их горячим металлом – для пущей уверенности, чтобы они не разрастались. Но и это не помогло. Каким-то чудным образом крылья еще больше преобразились. Засверкали-заискрились. Злые люди от них стали слепнуть, а добрые – приобретать острое зрение. Птица совершенно не знала, что ей делать. Решила стать затворницей.

А однажды ночью, спустя месяц, не выдержала, открыла окно – и выпорхнула в небо. В этот момент ее никто не мог остановить: ни родители, ни другие сородичи. Вмиг вся Вселенная осветилась красивыми яркими огнями: оперение птицы творило чудеса. И зрячие, и слепые обрели необычную способность – видеть не только красоту внешнюю, но и душевную: это ведь важнее. Наступила эра Добра и Любви. И всё благодаря Птице. Как вы помните, она была создана для высокого полёта.